**Білет 5**

## Практычнае заданне.
## Развіццё культуры ў БССР у другой палове 1940-х – 1980-ыя гг.

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні (выканайце заданні):**

1. Каму належала ідэя ўвекавечання памяці Хатыні і яе жыхароў?
2. Якія змены адбываліся ў 1960-1980-ыя гг. у сістэме вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР?
3. Як вы думаеце, чаму серыю карцін аб жахах фашысцкіх канцлагераў Міхаіл Савіцкі назваў "Лічбы на сэрцы"?
4. Прывядзіце аргументы, якія пацвярджаюць вывад аб тым, што беларуская культура садзейнічае захаванню гістарычнай памяці беларускага народа аб Вялікай Айчыннай вайне.

**І. Аб серыі карцін «Лічбы на сэрцы»** *(па матэрыялах БЕЛТА)*

| | |
|---|---|
| <br>М. Савіцкі<br>«Вязень 32815» | Міхаіл Савіцкі - беларускі жывапісец. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Улетку 1942 г. патрапіў у палон. Быў вязнем фашысцкіх канцлагераў Дзюсельдорф, Дахау, Бухенвальд. Жахам канцлагераў прысвечаны 16 палотнаў Міхаіла Савіцкага пад назвай "Лічбы на сэрцы" (1974-1980).<br>М. Савіцкі так апісваў мэту серыі "Лічбы на сэрцы": "Сама атмасфера нашага стагоддзя выклікае пякучую трывогу за лёс планеты і чалавека. Кожны з нас у адказе за будучыню. Па прычыне гэтай адказнасці я не маю права маўчаць. Мне прыйшлося быць сведкам жахлівых злачынстваў. І казаць пра іх, выявіць іх сутнасць неабходна. Таму я ўзяўся пісаць серыю карцін пра фашызм "Лічбы на сэрцы", каб у абагульненых вобразах паказаць тое, чаго нельга зразумець ні са слоўных апісанняў, ні з дакументаў. Я не мог не напісаць гэтую серыю. Па-першае, у імя памяці мільёнаў ахвяр, якія загінулі ў канцлагерах. Па-другое, дзеля моладзі, якая нарадзілася пасля вайны і таксама не павінна забыць …”<br>На карціне «Вязень 32815» аўтар адлюстраваў сябе на фоне брамы канцлагера Бухенвальд. На жэтоне, падвешаным на шыі, нумар зняволенага. |

**ІІ. З успамінаў Кірыла Трафімавіча Мазурава, першага сакратара ЦК КПБ**

У адзін з нядзельных дзён канца верасня 1964 года мы з Ціханам Якаўлевічам Кісялёвым - тады Старшынёй Савета Міністраў БССР - выехалі ў наваколле Мінска. Кіламетрах у 50 ад горада па віцебскай шашы згарнулі направа па першай, якая трапілася, дарозе. Ад'ехаўшы крыху, спыніліся ў бярозавым, працятым сонечнымі промнямі, пералеску. Прайшоўшы яго, выйшлі

на невялікую паляну… У цэнтры поля, на ўзгорку, убачылі спаленую вёску. Дзясяткі два абгарэлых печкавых труб, нібы помнікі, падымаліся да неба. Ад саміх двароў і дваровых пабудоў амаль нічога не засталося - толькі дзе-нідзе шэрыя каменныя падмуркі…

Перад намі была спаленая вёска, у якой пасля вайны так ніхто і не пасяліўся. Недалёка мы ўбачылі невялікі статак кароў. Прыглядаў за імі пажылы чалавек. Падышлі, разгаварыліся. Ад пастуха пачулі страшную гісторыю аб трагічнай гібелі вёскі Хатынь і яе жыхароў…

…Помнікаў загінуўшым вёскам на той час яшчэ не было. Узнікла думка ўвекавечыць памяць Хатыні і яе жыхароў…

Адкрыццё мемарыяльнага комплексу "Хатынь" адбылося ў дні святкавання 25-годдзя вызвалення рэспублікі ад фашысцкіх захопнікаў.

**ІІІ. Развіццё сістэмы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў БССР**

| | 1960-ыя гг. | 1980-ыя гг. |
|---|---|---|
| Колькасць сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў | 102 | 139 |
| Колькасць навучэнцаў у сярэдніх спецыяльных навучальных установах | 62, 6 тыс. чалавек | 160 тыс. чалавек |
| Колькасць вышэйшых навучальных устаноў | 24 | 33 |
| Колькасць студэнтаў у вышэйшых навучальных установах | 59 тыс. чалавек | 182 тыс. чалавек |